Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

28 КАСТРЫЧНІКА 2016 г. ПЯТНІЦА № 209 (28319)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Быць самой сабой**

СТАР. 5



**Бабуліны рэцэпты**

СТАР. 13



**Праграма тэлебачання на тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Анатоль КАЛІНІН, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Нам варта адмовіцца ад будаўніцтва адзіночных жылых дамоў і пераходзіць да стварэння камфортных кварталаў жылога асяроддзя. Там павінен быць дзіцячы садок, малыя архітэктурныя формы, спартыўныя пляцоўкі. І, наадварот, не павінна быць транспарту, яго трэба засяроджваць па перыметры. Такім чынам унутры жылога квартала ствараецца бяспека. Да таго ж гэтая тэрыторыя на працягу як мінімум 5 гадоў павінна ўтрымлівацца забудоўшчыкам дадзенага аб'екта. Ён пабудаваў і некалькі гадоў эксплуатуе, адказвае перад жыхарамі за якасць».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 28.10.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9101 | ▲ |
| Еўра | 2,0834 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0302 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0748 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# ВОСЕНЬ З КАМФОРТАМ



Фота БЕЛТА.

**Міжнародная выстава-кірмаш па аптовым продажы тавараў лёгкай і тэкстыльнай прамысловасці «Белтэкслегпрам. Восень 2016» адкрылася ў Мінску.**

**Выставу арганізавалі канцэрн «Беллегпрам», Нацыянальны выставачны цэнтр «Белэкспа», Міністэрства гандлю.**

■ Сітуацыя

## ТАКІ КАПРАМОНТ НАМ... ПАТРЭБНЫ?

### Як жыхары сталічнага 4-павярховіка адстойваюць свае правы на цяпло і святло

**Капрамонт у доме №22 па вуліцы Калініна ў Мінску цягнецца ўжо амаль год. За гэты час непрыемнасцяў тут здарылася больш, чым за ўвесь час існавання будынка. Асвятленне ў пад'ездзе зрабілі так, што палову лесвічнага пралёта на кожным паверсе прыходзіцца ісці ўпоцемку, перш чым дойдзеш да выключальніка. Працуючы з трубамі, рабочыя ледзьве не падпалілі кватэру, а вугал дома заліло дажджамі і сцяна прамокла наскрозь.**

СТАР. 4






СТАР. 2

# МІНСК ЯК СІМВАЛ ДЫЯЛОГУ

**Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка сустрэўся ўчора з намеснікам Генеральнага сакратара ААН — выканаўчым сакратаром Еўрапейскай эканамічнай камісіі ААН Крысціянам Фрыісам Бахам, паведаміў карэспандэнт БЕЛТА.**

Аляксандр Лукашэнка адзначыў важнасць таго, што Крысціян Фрыіс Бах не ўпершыню наведвае нашу краіну, і ў яго склалася сваё меркаванне пра Беларусь.

Што датычыцца дзейнасці Еўрапейскай эканамічнай камісіі, у рабоце якой удзельнічаюць 56 дзяржаў, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «Вашы праекты і даследаванні ў многіх галінах і, перш за ўсё, у эканоміцы, экалогіі, інавацыях, сферы транспарту, будаўніцтва, сацыяльнай сферы, прыватна-дзяржаўным партнёрстве ўносяць вялікі ўклад у развіццё нацыянальных праграм па адпаведных напрамках».

«Больш таго, мне прыемна з вамі сустракацца яшчэ і таму, што вы — чалавек, які прыхільны да гэтых напрамкаў, блізкі да землі, вельмі цэніце прыроду і развіваеце гэту прыроду», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тэму прыродаахоўнай дзейнасці. «Вядома, мы надаём вялікае значэнне гэтым пытанням. У Парыжы заключылі адпаведнае міжнароднае пагадненне. Гэта вялікая перамога, у тым ліку вялікі ўклад Еўрапейскай эканамічнай камісіі, — лічыць Прэзідэнт. — Але ўсё ж такі мы, напэўна, яшчэ да канца не ўсведамляем тое, што можа адбыцца з планетай і чалавецтвам, калі па-варварску будзем ставіцца да гэтых пытанняў, калі мы не будзем сістэмна падыходзіць да вырашэння многіх праблем, у тым ліку па гэтых напрамках, па якіх працуе ЕЭК. Таму наперадзе ў нас вельмі вялікі шлях, які мы павінны прайсці».

Беларусь гатова падзяліцца сваім вопытам прыродаахоўнай дзейнасці, у тым ліку ў час намечанай на 2017 год у Мінску канферэнцыі краін — удзельніц Канвенцыі ЕЭК ААН аб ацэнцы ўздзеяння на навакольнае асяроддзе ў трансгранічным кантэксце.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што пытанні прыродаахоўнай дзейнасці вельмі важныя для ўсіх краін. «Таму тымі даследаваннямі, навацыямі, якія вы праводзіце, вы ўзбагачаеце планету», — перакананы кіраўнік дзяржавы. «Мы сёння тут спрабуем выбудаваць дыялог на ўзаемавыгадных умовах, гаворым пра «інтэграцыю інтэграцый». Вопыт ярка дэманструе, што зараз не час будаваць межы, сцены, а трэба якраз наладжваць адкрыты, даверны дыялог».

У сваю чаргу Крысціян Фрыс Бах заявіў, што Мінск стаў сімвалам дыялогу ў самыя складаныя часы. Ён падкрэсліў важнасць правядзення ў Мінску гэтай канферэнцыі ЕЭК ААН.

Кіраўнік ЕЭК падзякаваў Аляксандру Лукашэнку за ініцыятыву Беларусі па прасоўванні ідэі дыялогу і камунікацый ва ўсім свеце, ён таксама адзначыў лідзіруючую ролю Беларусі ў аб'яднальных працэсах, у дзейнасці ЕЭК, а таксама звярнуў увагу на развіццё, якое дэманструе Беларусь па многіх напрамках.

ЕЭК ААН — адна з пяці рэгіянальных эканамічных камісій ААН. Створана ў сакавіку 1947 года, штаб-кватэра размешчана ў Жэневе (Швейцарыя). У склад ЕЭК уваходзяць 56 дзяржаў, уключаючы краіны Еўропы, ЗША, Канаду, Ізраіль і ўсе постсавецкія дзяржавы.

Беларусь з'яўляецца паўнапраўным членам ЕЭК ААН з моманту яе стварэння. Узаемадзеянне з камісіяй курыруе Міністэрства эканомікі. Прыярытэты супрацоўніцтва з ЕЭК ААН — спрашчэнне гандлю, транспарт, энергетыка, інавацыі, экалогія.

■ Сувязі

## Перамовы аб Мытным кодэксе працягнуцца

### Мінск прымае кіраўнікоў урадаў Еўразійскага эканамічнага саюза

Учора падчас сустрэчы прэм'ер-міністраў ЕАЭС (Арменіі, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана, Расіі) была прадстаўлена справаздача аб выкананні бюджэту за 2015 год і ўхвалены бюджэт на 2017-ы. Прэм'еры разгледзелі Мытны кодэкс Еўразійскага эканамічнага саюза. Па чатырох пунктах з 10, якія планавалася ўзгадніць, была дасягнута дамоўленасць. На наступным пасяджэнні Міжурадавага савета, які адбудзецца ў сярэдзіне лістапада ў расійскай сталіцы, плануецца канчаткова вырашыць гэта пытанне і падпісаць дакумент. Таксама прэм'еры абмеркавалі стварэнне агульнага рынку лекавых сродкаў ЕАЭС, канчатковае рашэнне па якім будзе прынята ў лістападзе.

«Не так актыўна, як хацелася б, ідзе рух насустрач у пытаннях рэалізацыі ўзгодненай сельскагаспадарчай палітыкі, зняцця бар'ераў на рынку, — адзначыў **прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй КАБЯКОЎ** на пашыраным пасяджэнні Міжурадавага савета ЕАЭС. — Ва ўрад паступаюць запыты прадпрыемстваў і арганізацый аб асабліваcцях працы на рынках краін саюза ў сучасных умовах, доступе да дзяржаўных закупак, арганізацыі транзіту і многіх іншых тэмах».

Акрамя таго, кіраўнікі ўрадаў закранулі пытанні кантролю за перамяшчэннем тавараў на тэрыторыі саюза, прымянення антыдэмпінгавых мер, міжнароднай дзейнасці Еўразійскай эканамічнай камісіі, а таксама аб прадаўжэнні тэрмінаў дзеяння пілотнага праекта па ўвядзенні маркіроўкі тавараў ідэнтыфікацыйнымі знакамі.

Сёння ў Нацыянальнай бібліятэцы, адбудзецца Савет кіраўнікоў урадаў Садружнасці Незалежных Дзяржаў, а таксама сустрэча на ўзроўні Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі. На парадку дня міжурадавага Савета СНД — 20 праектаў дакументаў, амаль кожны другі з якіх накіраваны на паглыбленне і пашырэнне ўзаемадзеяння ў эканамічнай сферы.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■ Дэмаграфія

# ПРЫРАСТАЕМ!

**Упершыню за ўсю гісторыю незалежнай Беларусі ў нас назіраецца натуральнае павелічэнне колькасці насельніцтва**



**Як заявіла ўчора намеснік начальніка аддзела народанасельніцтва, гендэрнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Марына АРЦЁМЕНКА, гэта гістарычны факт, што ўпершыню за ўсю гісторыю незалежнай Беларусі ў нашай краіне назіраецца натуральны прырост колькасці насельніцтва. Паводле яе слоў, гэта вынік ўзаемазвязаных фактараў, асноўнымі з якіх з'яўляюцца рост нараджальнасці і зніжэнне смяротнасці, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Прадстаўнік ведамства звярнула ўвагу, што на рост нараджальнасці ў Беларусі ў першую чаргу паўплывалі комплексныя паслядоўныя меры дзяржаўнай палітыкі. «На ўзроўні кіраўніка дзяржавы, урада ў апошнія гады быў прыняты шэраг кардынальных мер, накіраваных на стварэнне спрыяльных умоў для нараджэння і выхавання дзяцей у сем'ях. У Беларусі з 2007 года рэалізуецца ўжо трэцяя праграма дэмаграфічнай бяспекі», — нагадала яна.

Сярод іншага Марына Арцёменка паведаміла, што ў краіне дзейнічае разгалінаваная сістэма дзяржаўных дапамог, якая ўвесь час развіваецца. Пры гэтым у апошнія гады значна павялічаны памеры дапамог — напрыклад, у 2013 годзе ў два разы выраслі дапамогі па догляду дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў. Істотнымі таксама з'яўляюцца памеры аднаразовых дапамог у сувязі з нараджэннем дзяцей, і гэтыя дапаможнікі вельмі істотныя ў параўнанні з краінамі СНД і ЕАЭС.

Спецыяліст таксама нагадала, што ў 2015 годзе ў Беларусі пачала дзейнічаць маштабная сістэма доўгатэрміновай падтрымкі шматдзетных сем'яў — сямейны капітал. За перыяд дзеяння сямейнага капіталу адкрыта больш за 25 тыс. дэпазітных рахункаў. Мінпрацы лічыць, што дзякуючы ў тым ліку і гэтаму ў краіне паступовa павялічваецца колькасць шматдзетных сем'яў. Так, калі параўноўваць з дадзенымі перапісу 2009 года, калі налічвалася 62,5 тыс. шматдзетных сем'яў, цяпер іх колькасць перавысіла 85 тысяч. Акрамя таго, павялічваецца колькасць дзяцей, якія нарадзіліся трэцімі і наступнымі. У 2015 годзе доля дзяцей, якія нарадзіліся ў сем'ях трэцімі, склала больш за 16%.

«Актыўныя меры сацыяльнай падтрымкі сем'яў з дзецьмі знаходзяць водгук у насельніцтва. У 2015 годзе ў нас нарадзілася рэкордная колькасць дзяцей — 119 тыс. Нягледзячы на зніжэнне колькасці жанчын рэпрадуктыўнага ўзросту (назіраецца з 2013 года), рост нараджальнасці працягвае радаваць, і за 9 месяцаў бягучага года з'явілася на свет ужо больш за 89 тыс. дзяцей, што таксама больш, чым колькасць дзяцей, народжаных за аналагічны перыяд папярэдняга года», — канстатавала Марына Арцёменка.

Гаворачы аб магчымым змене заканадаўства, што датычыцца выплаты дапамог, намеснік начальніка аддзела адзначыла, што сёлета падрыхтаваны і ўнесены ў Палату прадстаўнікоў законапраект, які выкладае закон аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, у новай рэдакцыі. У прыватнасці, гэтым дакументам уводзяцца новыя меры па ўзмацненні сацыяльнай абароны сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў. «Сёння дапамога па доглядзе дзіцяці-інваліда прызначаецца непрацуючым асобам. Дык вось, у такіх асоб з'явіцца магчымасць працаваць па працоўнай дамове або на даму, на ўмовах няпоўнай занятасці, і адначасова атрымліваць дапамогу па доглядзе дзіцяці-інваліда», — патлумачыла Марына Арцёменка.

Яна таксама дадала, што ў сусветным рэйтынгу па ўмовах мацярынства Беларусь займае 25-е месца з амаль 180 краін свету і першае месца сярод дзяржаў СНД

■ Дзяржава і бізнес

# Пазіцыі палепшыліся

**Беларусь на 37-м месцы ў рэйтынгу Doing Business — 2017**

**Наша краіна заняла 37 месца ў рэйтынгу «Вядзенне бізнесу — 2017». Даследаванне сёлета праводзілася сярод 190 дзяржаў. У мінулым годзе ў гэтым рэйтынгу краіна займала 44 пазіцыю. Аднак пасля перагляду вынікаў у сувязі са з'яўленнем больш дакладных даных ад краін, якія прымалі ўдзел у даследаванні, лічыцца, што Беларусь займала ў справаздачы «Doing Business — 2016» не 44-ы, а 50-ы рэйтынгавы радок.**

Сёлета рэйтынг узначаліла Новая Зеландыя, пасунуўшы Сінгапур на другое месца. У топ-10 краін з найбольш спрыяльнымі ўмовамі для прадпрымальніцкай дзейнасці таксама трапілі Данія, Ганконг (спецыяльны адміністрацыйны раён Кітая), Рэспубліка Карэя, Нарвегія, Вялікабрытанія, ЗША, Швецыя і Македонія. На постсавецкай прасторы самае высокае месца займае Эстонія — 12-е. Следам за ёй на 14 месцы Латвія, на 16-м — Грузія, Літва — на 21-м. Казахстан заняў 35 месца, Арменія — 38-е, Расія — 40-е, Малдова — 44-е, Азербайджан — 65-е, Кыргызстан — 75-е, Украіна — 80-е, Узбекістан — 87-е, Таджыкістан — 128-е.

У гэтым дакладзе ўлічваліся рэформы, якія праводзіў ў перыяд з 2 чэрвеня 2015 года па 1 чэрвеня 2016 года. За гэты перыяд Беларусь ажыццявіла чатыры значныя рэформы, якія спрашчаюць вядзенне бізнесу. Краіна спрасціла працэдуру падключэння да сістэмы электразабеспячэння за кошт укаранення прынцыпу «аднаго акна» ў службе, якая займаецца ўсімі пытаннямі гэтай сістэмы, у тым ліку праектаваннем і будаўніцтвам размеркавальных сетак. Таксама спрасціліся працэдуры перадачы маёмасці за кошт узмацнення празрыстасці і надзейнасці сістэмы кіравання зямельныi рэсурсамі. Сёння для рэгістрацыі ўласнасці неабходна прайсці толькі дзве працэдуры і выдаткаваць тры дні, што дазволіла краіне выйсці на пятае месца ў свеце па паказчыку «Рэгістрацыя ўласнасці». Акрамя таго, была створана сістэма крэдытных гісторый, і Бюро крэдытных гісторый пачало прысвойваць ацэнкі крэдытаздольнасці пазычальнікаў. Краіна таксама зрабіла крокі, каб умацаваць абарону правоў мінарытарных інвестараў, тым самым гарантуючы прававую абарону ў выпадках, калі аперацыі звязаных бакоў наносяць кампаніі шкоду. Таксама ўзмацніліся патрабаванні да карпаратыўнай празрыстасці.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

■ Без закрытых тэм

# ІНТЭГРАЦЫЯ. ДАВЕР. ПАРАЗУМЕННЕ

## Міжнародная канферэнцыя ў Мінску сабрала палітыкаў з Еўропы і Азіі

**Тэмай яе сталі агульнаеўрапейскія інтэграцыйныя працэсы. Ці не кожны выступоўца падкрэсліў важнасць адкрытага дыялогу для мірнага жыцця рэгіёнаў. Удзел у мерапрыемстве прынялі прадстаўнікі Міністэрства замежных спраў нашай краіны, Еўразійскай эканамічнай камісіі, Еўрапейскага саюза, а таксама дэлегаты экспертнай супольнасці розных краін.**

**Яўген ШАСТАКОЎ, намеснік міністра замежных спраў,** падкрэсліў, што МЗС не чакае ад экспертаў «цуду» або чароўных рэцэптаў і імгненных вынікаў.

— Але мы заўсёды ўдзячны за іх унёсак у пошук рашэння актуальных і надзённых праблем, — дадаў намеснік міністра. — Мне здаецца, агульнаеўрапейская інтэграцыя сёння мае лёсавызначальнае, ключавое значэнне не толькі ў рэгіянальным, але і ў глабальным маштабе. Прычым мы адзначаем наяўнасць класічнага парадоксу: з аднаго боку існуе пастаянны запыт на інтэграцыю, з іншага — шэраг праяўленняў канфрантацыі, размежавання. Такую супярэчнасць можна патлумачыць тым, што мы каторы раз за апошнія дзесяцігоддзі з пэўнай рэгулярнасцю апынуліся на чарговым «піку» змены парадыгмы светаўкладу. Але гэта далёка не адзінае тлумачэнне.

Па словах намесніка міністра замежных спраў, сучасны парадак дня перагружаны геапалітычным супрацьстаяннем.

**Таццяна ВАЛАВАЯ, член калегіі (міністр) Еўразійскай эканамічнай камісіі па асноўных кірунках інтэграцыі і макраэканоміцы,** адзначыла, што мадэль Еўразійскага эканамічнага саюза будавалася на аснове вопыту еўрапейскай інтэграцыі.

— На працягу 90-х гадоў мы атрымлівалі велізарную падтрымку ад Еўрапейскага саюза па выпрацоўцы падыходаў да еўразійскай інтэграцыі: экспертную, прафесійную, тэхнічную, фінансавую, — звярнула ўвагу яна. — Усе дакументы, якія мы рыхтавалі па лініі Садружнасці Незалежных Дзяржаў, па дагаворы аб эканамічным і валютным саюзе, які мы падпісалі ў 1993 годзе, — рыхтаваліся з удзелам еўрапейскіх экспертаў. Мы заўсёды сыходзілі з таго, што наша еўразійская інтэграцыя, па сутнасці, у якасці сваёй мадэлі выкарыстоўвае еўрапейскі вопыт.

У наступным годзе Беларусь будзе старшынстваваць у рэгіянальнай арганізацыі — Цэнтральна-Еўрапейскай ініцыятыве. **Намеснік Генеральнага сакратара гэтага аб'яднання Маргот КЛЕСТЫЛЬ-ЛЁФНЕР**, якая таксама прыняла ўдзел у канферэнцыі, звярнула ўвагу на важнасць трансгранічнага супрацоўніцтва. Што да вырашэння тых сур'ёзных праблем, якія паўсталі сёння ў адносінах паміж Еўрапейскім, Еўразійскім эканамічным саюзамі, то, на яе думку, неабходна «аднаўляць давер». Маргот Клестыль-Лёфнер падкрэсліла, што гэта дапаможа ў тым ліку павысіць узровень бяспекі ў рэгіёне.

* * *

Экспертная ініцыятыва «Мінскі дыялог» запрацавала ў сакавіку 2015 года як пазаўрадавы форум па тэматыцы міжнародных адносін і бяспекі на еўрапейскім кантыненце. З моманту стварэння ініцыятывы ў яе рамках прайшлі чатыры паспяховыя міжнародныя канферэнцыі. Яны сабралі ў Мінску вядучых экспертаў з Еўрапейскага саюза, Злучаных Штатаў Амерыкі, Расіі, іншых дзяржаў Усходняй Еўропы. У рабоце канферэнцый прымалі ўдзел і высокапастаўленыя афіцыйныя асобы нашай краіны і замежжа.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■ Надвор'е

# СУЦЭЛЬНАЯ ХЛЮПОТА РАЗАМ З ХОЛАДАМ,

## ці Першая рэпетыцыя зімы

**У другой палове кастрычніка надвор'е беларусаў не радуе. І ў гэтыя выхадныя на тэрыторыі краіны чакаюцца дажджы і мокры снег, паведамляе галоўны сіноптык службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Святлана РЫБАКОВА.**



У пятніцу Беларусь трапіць пад уплыў атмасферных франтоў, якія рухаюцца да нас з боку Заходняй Еўропы. Таму на большай частцы тэрыторыі пройдуць ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу, вецер будзе паўднёва-заходні парывісты. Тэмпература паветра ўдзень складзе 1—7 цяпла, па захадзе — да плюс 9 градусаў. І ў суботу амаль паўсюдна па краіне чакаюцца дажджы, а ўначы па ўсходзе краіны пройдзе мокры снег, магчымы слабы галалёд. Вецер будзе паўночна-заходні парывісты. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад нуля па ўсходзе да плюс 6 градусаў па захадзе, удзень — 2—8 цяпла.

У нядзелю стане падмарожваць. У многіх раёнах пройдуць дажджы, па паўночным усходзе — з мокрым снегам. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаецца слабы галалёд, на дарогах — галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 да плюс 4 градусаў, а ўдзень — ад нуля да плюс 7 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, няўстойлівае надвор'е захаваецца і ў пачатку наступнага тыдня, а тэмпературны фон нават яшчэ панізіцца. У панядзелак на большай частцы тэрыторыі Беларусі чакаюцца кароткачасовыя ападкі, у асноўным мокры снег. Уначы і раніцай у асобных раёнах магчымы слабы галалёд, на дарогах — галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 да плюс 3 градусаў, а ўдзень — ад мінус 1 да плюс 6 градусаў. У аўторак на ўсходзе і па паўночным захадзе чакаецца ўжо выключна снег і мокры снег. Уначы і раніцай у асобных раёнах прагназуецца слабы галалёд, на дарогах — галалёдзіца. Уначы стане сапраўды падмарожваць да мінус 6 градусаў, а ўдзень будзе ад мінус 2 да плюс 3 градусаў.

Заўважу, што на гэтым тыдні на ўсходзе нашай краіны надвор'е арганізавала нам першую рэпетыцыю зімы. Спецыялісты Белгідраметцэнтра адзначаюць, што па стане на раніцу 27 кастрычніка па ўсходзе Гомельскай, Магілёўскай, Віцебскай абласцей вышыня снегу дасягала 1—8 см, а ў Мсціслаўскім раёне — да 14 см. А наперадзе яшчэ толькі лістапад...

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■

# НА ДНЕ ЯРА

## Якія таямніцы захоўваў звычайны гараж у Магілёве

**Дзяніс Манкевіч і зараз прыгадвае гэтую гісторыю з нейкім трапятаннем. Пачаў капаць у гаражы яму для агляду машыны, раптам зямля асела і з пяску паказаліся падэшвы чыхсьці спарахнелых ботаў з чалавечымі косткамі. Ён аж скалануўся ад нечаканасці. Чуў, што падчас вайны тут ішлі баі, але нават не падазраваў, што яго гараж стаіць на костках.**



### Ідэнтыфікаваць немагчыма

Гаражны кааператыў, дзе 15 гадоў таму Дзяніс набыў нерухомасць для свайго «Мерседэса», знаходзіцца прама ў рове за пяціпавярховікамі па вуліцы Лазаранкі. Адсюль рукой падаць да маленькай рачулкі Струшня. Некалькі гадоў таму мужчына зрабіў да гаража прыбудову, падняў дах. А сёлета дайшлі рукі і да машыннай ямы. Вырашыў, што справіцца сам, без памочнікаў. Прабіў цэмент у падлозе, адкінуў рыдлёўкай насыпаны зверху рачны пясок — тут усё і адкрылася. «Напэўна, не хапіла некалькі сантыметраў, каб іх знайсці, калі тут будаваліся гаражы», — мяркуе гаспадар.

Убачыўшы косткі, ён адразу ж пачаў біць трывогу. На сігнал прыехалі пашукавікі, міліцыя, прадстаўнікі з ваенкамата, гарвыканкама. Яны выказалі здагадку, што гэта пахаванне часоў вайны, апячаталі гараж і запрасілі спецыялістаў 52-га асобнага спецыялізаванага батальёна. Праз некалькі дзён яны прыехалі і правялі раскопкі. Знайсці атрымалася астанкі толькі аднаго чалавека. На жаль, яго імя так і застанецца невядомым.

— Адзінае, што можна дакладна сказаць, ён быў вельмі вялікі — вышэйшы за два метры. І ва ўзросце паміж 30 і 40 гадамі, — кажа **кіраўнік абласнога клуба ВІККРУ, пісьменнік і пашукавік Мікалай БАРЫСЕНКА.** — Але дакладна сцвярджаць, апалчэнец гэта або немец, немагчыма. Акрамя падэшваў ад ботаў, пры ім знайшлі некалькі гільзаў — савецкую і нямецкую. І гэта ўсё.

### З комы сябра так і не выйшаў

Месца раскопак і зараз стаіць некранутае. «Сумняваецеся, што пад вашым гаражом былі пахаваны толькі адзін чалавек?» — цікаўлюся я.

Уладальнік гаража паціскае плячыма: пошукавікі нікога болей не знайшлі, а яны людзі вопытныя. Але, кажа, адчуванні ўсё роўна трывожныя. Ніякіх тагасветных галасоў і прывідаў ён тут не чуў і не бачыў. Але, прызнаецца, калі спускаешся ў роў да свайго гаража, сэрца пачынае міжволі трапятаць.

А пасля таго як пад падлогай гаража выявілісь чалавечыя астанкі, сталі ўзгадваць ўсе няшчасці, якія так ці інакш тут здараліся. Амаль кожны год прыходзілася мяняць машыны, прызнаецца Дзяніс. Яны то ламаліся, то траплялі ў нейкія дарожна-транспартныя здарэнні. Вось і зараз машыны няма. Незадоўга да страшнай знаходкі аўто пабывала ў аварыі, і яго прыйшлося прадаць па запчастках. Але аднымі машынамі няшчасці не абмяжоўваліся. Была справа — абакралі гараж. А аднойчы ў ім нават сябра Дзяніса памёр.

— Непадалёк ад гаража страціў прытомнасць, мы яго на руках прыцягнулі ўнутр, паклалі на канапу, — успамінае суразмоўца падрабязнасці той жудаснай гісторыі. — Але ён пасля таго, як упаў у кому, так з яе і не выйшаў. Зусім малады хлопец быў яшчэ — 25 гадоў. Не хварэў, не піў. Скардзіўся, праўда, на моцны галаўны боль.

### Не проста дрэнная энергетыка

Мясцовыя ўфолагі да такіх падазрэнняў аднесліся скептычна. Маўляў, увесь зямны шар пакрыты чалавечымі косткамі, але ж нічога, жывём сабе спакойна. Тым не менш тэма для развагі ёсць.

**Намеснік дырэктара абласнога мастацкага музея імя П. Масленікава Святлана СТРОГІНА**, напрыклад, нагадала, што ў Сярэднявеччы, калі тут яшчэ было зусім бязлюднае поле, гэты роў стаў месцам пакарання ўніяцкага свяшчэнніка. Шмат крыві тут пралілося і ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

«Падчас абароны ў гэтым куце немцы расстрэльвалі савецкіх патрыётаў, — сведчыць Мікалай Барысенка. — У 500 метрах ад гаража, дзе знайшлі чалавечыя астанкі, ёсць брацкае пахаванне апалчэнцаў. А пазалетась непадалёк ад сёлетняга месца пахавання былі паднятыя астанкі яшчэ чацвярых чалавек. Іх таксама не атрымалася ідэнтыфікаваць. Захаваліся абцасы з падкоўкамі, як у немцаў. Але ж нашы таксама маглі насіць такі абутак. Наогул, у гэтым месцы цяжка знайсці нейкі карысны для пашукавікоў матэрыял. Тут доўга была смяццевая яма і ўсё перамяшалася».

**Аляксандр ТОМАЎ, дацэнт кафедры агульнай фізікі МДУ імя Куляшова**, таксама аднёсся да гісторыі сур'ёзна:

— Наконт таго, што ў гаспадара гаража ламаліся машыны, нічога сказаць не магу. Бо ў тагасветныя сілы не веру. А вось наконт таго, што камусьці ў гаражы стала кепска, можна выказаць здагадку. Аналагічны выпадак адной чы адбыўся ў Херсоне. Уявіце сабе высокі бераг і яры, якія доўгі час засыпаліся смеццем. Потым на гэтым месцы пачалі будаваць прыватныя дамы і капаць падвалы. Людзі заходзілі ў тыя падвалы і паміралі. Пачалі высвятляць, у чым справа, і асноўнай версіяй гэтых смярцей стала тое, што нешта ўнізе гніе і ўтвараюцца газы, якія цяжэйшыя за паветра і могуць назапашвацца ў нізінах, падвалах і гэтак далей. Не выключана, што і тут падобны выпадак. Калі быў яр і ў гэтым месцы нешта засыпалі, раўнялі, то тут трэба весці сябе вельмі асцярожна.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

■

■ Сталічны час

# Медыцынскія работнікі — нарасхват, кіроўцаў, грузчыкаў і дворнікаў — у лішку

## Якія асаблівасці мае рынак працы ў Мінску?

**За 9 месяцаў гэтага года ў дзяржаўную службу занятасці насельніцтва ў сталіцы звярнуліся 20,1 тыс. чалавек, 14,5 тыс. з іх атрымалі статус беспрацоўнага. Пра тэндэнцыі ў гэтай сферы расказала намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Таццяна КУДЗЕВІЧ.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Узровень беспрацоўя ў Мінску складае 0,6%, па ўсёй рэспубліцы — 0,9%. На 1 кастрычніка ў статусе беспрацоўнага ў сталіцы былі зарэгістраваныя 6,5 тыс. чалавек, у той час як вакансій заяўлена — 7,9 тыс. Пры такіх суадносінах звесці беспрацоўе да нуля перашкаджае прафесійна-кваліфікацыйны дысбаланс: попыт і прапановы не заўсёды адпавядаюць адно аднаму. 50% з прапанаваных вакансій — па рабочых спецыяльнасцях. Высокі попыт на арматуршчыкаў, бетоншчыкаў, каменшчыкаў, страхароў, маляроў, больш за ўсё патрэбныя прадаўцы, повары і прыбіральшчыкі памяшканняў. А вось для таго, каб заняць месца грузчыка, вартаўніка або дапаможнага рабочага, прыйдзецца вытрымаць сур'ёзную канкурэнцыю. Што датычыцца кваліфікаваных спецыялістаў, то зараз вострая неабходнасць назіраецца ў медыцынскіх работніках: 400 вакансій для дактароў-спецыялістаў і больш за 650 для медыцынскіх сясцёр. Бухгалтарам, юрыстам і эканамістам без унушальнага партфоліа, наадварот, знайсці працу вельмі цяжка. У цэлым у параўнанні з мінулым годам патрэба ў кадрах узрасла на 16%. Сярэдняя заработная плата — ад 500 рублёў. У большасці атрымліваецца працаўладкавацца на працягу 3-4 месяцаў.

Каля чвэрці ўсіх, хто рэгіструецца ў якасці беспрацоўнага, складаюць тыя, у каго завяршыўся тэрмін дзеяння папярэдняга кантракта, 19% — працаўладкоўваюцца ўпершыню. Кожны трэці вяртаецца на біржу працы паўторна. Характэрна, што амаль 3/4 беспрацоўных — мужчыны, з кожным годам сярэдні ўзрост саіскальнікаў павялічваецца: у 2015 — 38 гадоў, у 2016 — 41 год.

З мэтай павышэння канкурэнтаздольнасці беспрацоўных грамадзян дзейнічаюць спецыяльныя праграмы па іх навучанні і перакваліфікацыі. З пачатку года было арганізавана навучанне больш як тысячы чалавек па самых запатрабаваных прафесіях. Курсы доўжацца ад некалькіх тыдняў амаль да года — для перападрыхтоўкі. У гэты перыяд прадугледжана выплата стыпендый у памеры ад 1 да 3 базавых велічынь. У лістападзе, напрыклад, будзе праводзіцца навучанне на аператара кацельні, бухгалтара з веданнем 1С, электрагазазваршчыка, спецыяліста па лагістыцы, сакратара, кладаўшчыка. Пасля навучання ў 88% атрымліваецца ўладкавацца па новаабытай прафесіі. Актыўна падтрымліваецца і самазанятасць насельніцтва: у гэтым годзе 118 прадпрымальнікаў-пачаткоўцаў атрымалі субсідыі. Дзейнічаюць спецыяльныя праграмы для працоўнай адаптацыі інвалідаў.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

■

# НА СУСТРЭЧУ З ВІКТАРАМ ТУРАВЫМ

**Да 4 лістапада ў кінатэатрах Магілёва і вобласці будзе магчымасць далучыцца да творчасці гэтага вядомага кінематаграфіста.**

Магілёў ганарыцца тым, што менавіта тут нарадзілася будучая зорка беларускага кіно, тут таленавіты юнак прайшоў свае першыя творчыя ўніверсітэты, сюды імкнуўся на сустрэчу са сваімі сябрамі і блізкімі. Пасля вучобы ва Усесаюзным інстытуце кінематаграфіі ў Маскве Віктар Тураў працаваў на кінастудыі Беларусьфільм, узначальваў Саюз кінематаграфістаў БССР, вёў рэжысёрскую майстэрню ў Беларускай акадэміі мастацтваў. Яго прозвішча рашэннем ЮНЕСКА ўнесена ў спіс 50 вядомых кінематаграфістаў свету. Сёлета ў Віктара Цімафеевіча юбілей, яму спаўнялася 80 гадоў. На жаль, ён заўчасна пайшоў з жыцця, але працягвае жыць у сваіх праніклівых кінатворах. За сваё жыццё ён зняў 26 фільмаў. «Праз могілкі», «Я родам з дзяцінства», «Сыны ідуць у бой», « Кропка адліку», «Людзі на балоце», «Подых навальніцы», «Меншы сярод братоў», «Пераправа», «Чорны бусел» — гэтыя і іншыя фільмы сёння прадстаўлены залатым фондам беларускага кіно. У Магілёве ў гонар Віктара Турава названа вуліца, а на фасадзе кінатэатра «Радзіма» знаходзіцца памятная дошка.

Падчас кінатыдня, прысвечанага творчасці беларускага майстра, у Магілёве пройдуць выставы, адбудуцца творчыя сустрэчы з вядомымі дзеячамі беларускага кінематографа, а таксама з аднакласнікамі, калегамі, сябрамі і роднымі Віктара Турава.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

# ТАКІ КАПРАМОНТ НАМ... ПАТРЭБНЫ?

## Траншэя замест падлогі

Больш за ўсіх дасталося кватэры №35 на першым паверсе, пад падлогай якой знаходзяцца зямля і трубы. З гэтай прычыны яна і раней была сырой ды няўтульнай, а цяпер увогуле стала амаль непрыдатнай для жылля.

— Мы пралічылі супраціўленне цеплаперадачы падлогі ў памяшканнях першага паверха — яно прыкладна 0,63, хоць павінна быць па нарматывах каля 2, — расказаў **Андрэй ПАЛЯВІК, упаўнаважаны жыхароў дома №22** па капітальным рамонце. — Праз гэта амаль ва ўсіх кватэрах першага паверха па нізе сцен паўзе цвіль. Мы звярталі на гэтую праблему ўвагу ЖКГ, аднак пэўнага рашэння так і не дамагліся.



**Падчас замены труб амаль месяц так выглядала падлога на кухні ў кватэры №35.**



**Вось такі выгляд меў ванны пакой.**



**Такі люк у падлозе кухні Зінаіды ГАЎРЫЛАВАЙ павінен заставацца непрыбітым, каб у выпадку аварыі быў доступ да труб, што праходзяць пад падлогай кватэры.**

У **Зінаіды ГАЎРЫЛАВАЙ, гаспадыні кватэры №35**, ёсць леташні акт, складзены камісіяй з мясцовай жыллёвай службы, дзе зафіксавана, што ў хаце не працуе вентыляцыя, прагніла падлога і ёсць цвіль. Аднак справа далей гэтай паперы так і не зрушылася.

Каб памяняць трубы ў кухні і ванным пакоі кватэры №35, прыйшлося зняць падлогу. Тыдзень спатрэбіўся на замену камунікацый, а яшчэ два жанчына жыла без туалета, вады і абыходзіла літаральна раскапаную траншэю, якая вяла прама на вуліцу. На ноч пенсіянерка накрывала яе кардонам і ставіла цяжкія прадметы, каб у кватэру не лезлі каты.

— Мне казалі, што няма дошак на замену гнілых, таму і не закрываюць траншэю. Цяпер падлогу вярнулі на месца, а ў ванным нават паклалі новую кафлю. Хоць спачатку хацелі перарабіць толькі ўчастак, які пацярпеў пры знязці ўнітаза і ванны, ды яшчэ і класці яе паверх старой кафлі. А аднойчы рабочыя нешта зварвалі, і ў мяне з-пад падлогі пайшло полымя — ледзьве сцяна не загарэлася. Добра, што я дома была, а калі б не? — паскардзілася Зінаіда Гаўрылава і паказала металічныя бляшанкі на падлозе, якімі яна закрыла месцы, дзе разгаралася вогнішча.

Частка труб праходзіць і пад двума пакоямі жыхаркі. Гэтыя камунікацыі таксама прыйдзецца мяняць. Адсяляць на гэты час жанчыну ў падменнае жыллё ніхто не збіраецца — няма куды.

— Замяніць трубы інакш як праз зняцце падлогі немагчыма, бо пад гэтай і яшчэ адной кватэрай у доме няма падвала. Дакопваць частку падвала — гэта ўжо рэканструкцыя і зусім другія грошы, — расказаў **Сяргей ЖАХОЎСКІ, галоўны інжынер ЖКГ Першамайскага раёна**, заказчык работ па капрамонце дома №22. — Дарэчы, гаспадыня доўга не пускала нас у хату, каб пачаць работы. Ледзьве яе ўгаварылі. Падлогу прыйдзецца здымаць і ў яе абодвух пакоях, і ў іншай кватэры, каб замяніць камунікацыі.

**Незадаволеныя жыхары і знешнім выглядам сцен пасля пракладкі электрасетак. Яны настойваюць, што па дагаворы майстры павінны былі вярнуць усё ў першапачатковы стан.**



**У пад'ездзе месцы былых электракабеляў камунальнікі пафарбуюць, астатняя частка сцяны — за кошт жыхароў.**

**Як патлумачыў прадстаўнік ЖКГ, шэрыя цэментныя «струмені» на пад'ездных сценах, якія хаваюць штробы з электрычнымі праводамі, камунальнікі пафарбуюць у тон існуючай фарбы. Аднак толькі ў тым месцы, дзе былі кабелі. У кватэрах жа, дзе электралічыльнікі схавалі ў сцяну, усе канаўкі з камунікацыямі зашпаклявалі, але пераклейваць шпалеры ці фарбаваць сцены павінны самі жыхары. Тым, хто не хацеў штрабіць сцяну, правады праклалі ў карабы.**

**Дзіўны праект па асвятленні пад'ездаў дома №22 таксама перарабіць. Жыхары пісьмова прапанавалі ЖКГ некалькі схем перарабкі электраправодкі, аднак камунальнікі зробяць інакш:**

**— Замест люмінесцэнтных лямпачак мы паставім там святлодыёдныя з датчыкамі руху. Яны акустычныя, антывандальныя і будуць запальвацца адразу на ўсіх паверхах, калі чалавек увойдзе ў пад'езд.**

## Дождж ідзе — вада цячэ, а сцяна мокне

Падвесці камунікацыі да дома і падключыць ацяпленне да маразоў рабочыя паспелі, а ўцяпліць фасад — не. І Зінаіда Гаўрылава, як і іншыя жыхары, сутыкнулася з іншай праблемай — кастрычніцкімі дажджамі заліло ўвесь вугал дома, а ў пакоі жанчыны сцяна ўвогуле прамокла наскрозь.

Падчас рамонту страхі і дэмантажу вадасцёка па ўсім перыметры дома на месца дзірак паставілі невялікія кавалачкі труб, якія аднак не злучылі з трубамі на фасадзе. У выніку дождж пацёк на будаўнічыя рыштаванні, а адтуль — проста па сцяне. Стары фасад да таго ж мае яшчэ і шчыліны, некаторыя з якіх аказаліся скразнымі (!). Праз іх сценка набрала столькі вільгаці, што ў кватэры №35 ад яе пачалі адставаць шпалеры.

**«Загадалі мне зняць шпалеры і хацелі ўключыць свой сушыльны агрэгат у маю разетку. Я не пагадзілася, тады яны сышлі і больш ніхто не з'яўляўся сушыць маю сцяну».**

— Каб пазбавіцца ад гэтых шчылін, у іх залілі раствор, а звонку «сшылі» сталёвай арматурай, якую загналі ў сцяну. Адпаведна ў гэтых месцах з'явіліся «масцікі холаду». Магчыма, вільгаць па сцяне ў кватэры №35 пайшла таму, што шмат раствору трапіла менавіта на першы паверх, бо шчыліны тут большыя, чым уверсе. Сохне такі матэрыял тры дні, — выказаў думку галоўны інжынер. — Калі пасля высыхання матэрыялу і сцяны сляды зацякання застануцца, падрадная арганізацыя зробіць гаспадыні касметычны рамонт.

На дождж, які зацякае праз знятыя аконныя і балконныя адлівы і льецца з рыштаванняў па сцяне, насычаючы яе вільгаццю, скардзіцца і Вольга, жыхарка кватэры №47 на чацвёртым паверсе:

— Яшчэ невядома, калі будзе ўцяпляцца фасад! Дык хоць бы паздымалі дошкі з рыштаванняў, каб не цякло яшчэ больш па сцяне, ды вярнулі назад адлівы пад вокны. Я ўжо не кажу, што ледзьве не ўсе кватэры чацвёртага паверха былі залітыя, пакуль будаўнікі рамантавалі страху. Мы з імі дагэтуль разабрацца не можам.



**Заліты вадой вугал і залітыя растворам шчыліны на фасадзе.**

Дождж — не дождж, а рабочыя вырашылі ўсё ж мокры фасад уцяпляць. Прывезлі цеплапушку, каб тэрмінова прасушваць сцяну звонку, і пенапласт таўшчынёй... у 3 см. Жыхары спынілі іх работу. Цяпер фасад пад дажджамі сохне самастойна, гаспадары кватэр абмяркоўваюць таўшчыню неабходнага ім слою ўцяпляльніка, а літаральна на днях пад дах над вуглом паставілі часовы кавалак трубы.

— Сцяна з сілікатнай цэглы не магла прамокнуць наскрозь — максімум на 1,5 см у глыбіню, — упэўнены камунальнік. — За гадзіну работы цеплапушкі сцяна б высахла. Аднак мы вымушаны цяпер чакаць, аб якой таўшчыні ўцяпляльніка дамовяцца жыхары.

У кватэру да Зінаіды Гаўрылавай таксама прыходзілі з цеплавентылятарам, каб прасушыць мокрую сцяну ў пакоі.

— Загадалі мне зняць шпалеры і хацелі ўключыць свой сушыльны агрэгат у маю разетку. Я не пагадзілася, таму што яны павінны карыстацца для работы сваімі кропкамі падключэння энергіі па-за межамі кватэр, — расказала жанчына, паказваючы дагавор. — Тады яны сышлі і больш ніхто не з'яўляўся сушыць маю сцяну.

Па словах жа рабочых, яны самі не сталі ўключаць абсталяванне, бо ў пенсіянеркі ўсюды былі раскладзены паперы, якія праз высокую тэмпературу пры праграванні маглі загарэцца.



**Падобны металічны каркас на месцы былога балкона ўжо правераны на трываласць. Атрыманыя вынікі накіраваны на зацвярджэнне экспертызы.**

## 3, 5 ці 7 сантыметраў?

Перад пачаткам капрамонту ўвосень мінулага года жыхароў абвясцілі пра работы, якія маюць адбыцца. Непрыемнасці пачаліся адразу, як высветлілася, што запланаванай тэрмашубы з мінералваты таўшчынёй 11 см дом не атрымае. Замест яе фасад аздобяць слоем 3-сантыметровага пенапласту. Жыхары з такім рашэннем не пагадзіліся.

— Таўшчыню ўцяпляльніка паменшылі, а вось характарыстыкі ацяпляльных сістэм, разлічаных на работу пад тэрмашубай, робіцца па-ранейшым варыянце, — выказаўся Андрэй Палявік. — Паколькі ўсё лета ніякія работы не вяліся, мы думалі, што яны пераразлічваюць неабходную магутнасць цеплазабеспячэння. Аднак нам паведамілі, што новы праект не патрэбны, бо ацяпляльная сістэма будзе добра працаваць нават пры значна менш уцепленым фасадзе. Аднак мы ўпэўнены, што 3 см пенапласту не выратуюць ад холаду.

Сяргей Жахоўскі тлумачыць змяненне ў праекце тым, што праграма капрамонту на шэсць гадоў адстае ад існуючых рэалій.

— Летась дзейнічаў загад Мінжылкамгаса, дзе на 1 $м^2$ пры капрамонце выдаткоўвалася 1,5 млн рублёў старымі грашыма. У выпадку дома №22 у гэты кошт не ўклаціся. Цеплатрасу мы замянілі поўнасцю, прыкладна праз два тыдні зрэжам на кухнях жыхароў газавыя калонкі і наладзім сістэму цэнтралізаванага падагрэву вады. Гэта вельмі дарагая аперацыя, таму ўцяпленне дома мы спачатку ўвогуле выключылі з праекта. Аднак на фасадзе шмат шчылін, таму вырашылі ўцяпляць яго пенапластам таўшчынёй 3 см. Згодна з нарматывамі, гэтага дастаткова для работы адпаведнага абсталявання, таму і магутнасці ацяпляльнай сістэмы мы не мянялі. Аднак гэта не значыць, што іх не пералічвалі, — зазначыў галоўны інжынер. — Я гатовы заключыць з галоўным упаўнаважаным дома дагавор на ўцяпленне фасада таўсцейшым слоем матэрыялу. Папярэдні разлік паказаў, што пры ўцяпленні фасада пенапластам таўшчынёй 5 см даплаціць прыйдзецца прыкладна па 50—60 рублёў з кватэры.

За таўсцейшы слой уцяпляльніка на фасадзе дома №22 па Калініна жыхары згодны даплаціць самастойна. Камунальнікі ў сваю чаргу гатовыя вырашыць пытанне ў бліжэйшыя тыдні, калі ўласнікі пісьмова вызначацца з таўшчынёй пенапласту (5 ці 7 см) для ўцяплення і пацвердзяць, што за нязгодных плаціць грошы ўнясуць астатнія жыхары. Пакуль 11 з 48 кватэр супраць дадатковых укладанняў.

Як бачна, многіх праблем, як і зацягвання тэрміну рамонту, не здарылася б, калі б жыхары і ЖКГ своечасова ўсвядомілі жаданні і магчымасці адзін аднаго. Пакуль жа капрамонт у доме №22 па вуліцы Калініна працягваецца.

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by.*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

TV@R

## Ірына РАМБАЛЬСКАЯ:

# «Ахвотна сядзела б у кадры з пэндзлікам і ў запляміленых фарбамі джынсах»

**...10 год таму яна, юрыст з «чырвоным» дыпломам і другакурсніца факультэта журналістыкі, прыйшла на «Сталічнае тэлебачанне» напрактыкавацца — у выніку вучобу кінула, а ў прафесіі тэлежурналіста засталася. На вачах у гледачоў тэлевядучая ператваралася з гламурнай бландзінкі ў стрыманую шатэнку і наадварот, пазбаўлялася часткі прозвішча, эксперыментавала з вобразам і адзеннем... Пра тое, што змянілася за мінулыя гады, а што засталося ў багажы, гутарым з Ірынай Рамбальскай — тэлевядучай («24 гадзіны», «Вялікі сняданак») і прэс-сакратаром тэлеканала СТБ.**



Адзін з першых эфіраў Ірыны Рамбальскай.

***— За 10 год некаторыя тэлевізійнікі паспяваюць змяніць не тое што некалькі каналаў, але і некалькі краін. Чаму з СТБ у вас атрымалася такая ўзаемная любоў?***

— Шчыра кажучы, я таксама не чакала падобнага пастаянства. Прыйшла, папрасілася працаваць «у навіны». Мне хацелі адмовіць, бо меркавалі, што я зацікаўлюся культурай і падобнымі тэмамі, — але я хацела пісаць пра эканоміку і права, і мяне прынялі на стажыроўку, а потым засталася працаваць карэспандэнтам. Сёння, мне здаецца, многія забываюць адну рэч: не варта прыходзіць на тэлебачанне, каб здабыць папулярнасць — такія затрымліваюцца, мабыць, на год, а потым знікаюць. Тэлебачанне — праверка на трываласць, бо яно накладвае шэраг абмежаванняў і забірае шмат часу з іншых сфер жыцця; аднак калі ты гэту праверку прайшоў, значыць, табе сапраўды хацелася тут працаваць. Асабіста мне знаходзіцца тут вельмі лёгка — магчыма, таму, што гаворка ідзе не пра велізарную машыну медыяхолдынгу са складанай «вертыкаллю», а пра зладжаную каманду, у якой можна практычна кожнаму чалавеку патэлефанаваць у любы час, і табе дапамогуць... Не ўяўляю, як можна прамяняць СТБ на іншы тэлеканал — прыкіпела да яго і адчуваю шчырую адданасць.

Скарыстаўшы выпадак, скажу, што цяпер мы шукаем «свежую кроў» і плануем набіраць новых карэспандэнтаў. Таму, калі ў каго ёсць жаданне стаць журналістам, нават не маючы профільнай адукацыі і ва ўзросце «далёка за 20», — ласкава запрашаем, усе анкеты будуць разгледжаны!

***— Дарэчы, журфак вы так і не скончылі... Варта заняцца гэтым цяпер, хоць бы дзеля радка ў рэзюмэ, альбо ўжо няма патрэбы?***

— Сёлета я заканчваю Акадэмію ўпраўлення пры Прэзідэнце па спецыяльнасці «Міжнародны маркетынг». А на журфаку БДУ правучылася ўсяго два гады, нават паўтара — і няхай прабачыць мяне цяперашні Інстытут журналістыкі, але, на маю думку, тых ведаў, якія ён дае, недастаткова ў тэлевізійнай кар'еры. Таму журналісцкая адукацыя ў нас — хутчэй дадатковая, усё адно журналістам даводзіцца праходзіць курсы павышэння кваліфікацыі, а то і не адны. Бо на практыцы ты не можаш пісаць пра АДКБ або пра БРІКС, не разумеючы пэўных механізмаў іх фарміравання і функцыянавання. Узяць хоць падводку для вячэрняга выпуску навін: вось карэспандэнт сказаў «ніжняя палата», «верхняя палата» — і ты мусіш дакладна ведаць структуру парламента, хто канкрэтна і што прымае, ухваляе, зацвярджае... Адзін час у нас нават практыкаваліся экспрэс-экзамены: трэба было адказаць, хто сёння на пасадзе міністра эканомікі, хто ўзначальвае ГУУС, і гэтак далей — і падобныя экзамены здаваць зусім не сорамна! Да таго ж, калі я вяду і навіны, і «Вялікі сняданак», трэба арыентавацца не толькі ў эканамічным і палітычным жыцці краіны і свету, але адрозніваць Ігара Маісеева ад Барыса Маісеева... *(Смяецца.)* Неўзабаве планую пайсці да выкладчыка па тэхніцы маўлення, бо некалі займалася правільнай пастаноўкай голасу, потым стала мала часу, а ўдасканальвацца — і я гэта разумею лепш за каго іншага — трэба.

***— Такая пастаянная самаадукацыя — унутраная неабходнасць альбо рэакцыя на знешнюю крытыку?***

**11.00, 14.00** Весткі.
**11.20 Маст. фільм «Закаханы па ўласным жаданні».**
**13.15, 14.20 Маст. фільм «Люба. Любоў».**
**17.00** «Суботні вечар».
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.55** «Гумар! Гумар! Гумар!»
**22.40 Маст. фільм «Яна збіла лётчыка».**

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 8.20 Серыял «Дарожны патруль».**
**8.00, 10.00, 14.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.45** «Іх норавы».
**9.15** «Вуснамі дзіцяці».
**10.25** «Галоўная дарога».
**11.05** «Ежа жывая і мёртвая».
**12.05** «Кватэрнае пытанне».
**13.20** «Удача ў прыдачу!»
**14.15** «Паедзем, паядзім!»
**15.05** «Аднойчы...»
**16.20, 19.20 Серыял «Брат за брата».**
**23.15** «Таямнічая Расія».

### 8 канал

**9.00, 15.00, 19.15, 21.15, 23.55** «Надвор'е».
**9.05** М/ф «Казка пра залатога пеўнічка».
**10.00 Серыял «Чалавек у высокім замку».**
**11.00** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**11.10 Серыял «Дварцовыя тайны».**
**14.15** «Глядзім усёй сям'ёй». М/ф «Тачкі».
**16.00** «Адшукваецца адпачынак».
**16.30 Серыял «Айцец Браўн».**
**17.20** М/с «Іван і Мітрафан».
**17.45, 19.20, 21.00** «Хатняя крама».
**17.50, 19.25 Серыял «Хросная маці», 1—2-я серыі.**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Фэшн is my прафэшн».
**21.20 Драма «Мажэстык».**

### ВТБ

**6.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**6.30** «Мой тата круцейшы!»
**7.30** «Ералаш».
**8.00** М/ф «Смяшарыкі».
**8.15** М/ф «Маша і мядзведзь».
**8.30** М/ф «Гадкае качаня і я».
**9.00** «Вялікая маленькая зорка».
**10.00, 1.45** «Турбаміксер».
**12.00** Серыял «Сям'я 3D».
**13.00** Серыял «Апошні з Магікян 5».
**15.00** Фантастыка «Робасапіен: перазагрузка».
**17.00** М/ф «Кот Гром і зачараваны дом».
**19.00** Баявік «Бой з ценем».
**21.45** «Уральскія пельмені».
**23.05** «Ленінградскі Stand-up клуб».
**0.00** Камедыя «Голыя перцы».
**4.00** «Дурні і дарогі».
**4.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**5.30** «Лаві момант».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** «Звычайны канцэрт».
**10.35** «Тры таполі на Плюшчысе». Маст. фільм.
**11.50** «Тацццяна Ліёзнава. Дажыць да светлай паласы». Дак. фільм.
**12.45** Пернікавы домік. «Жыхары краю зямлі».
**13.15** Валерый Халілаў і Цэнтральны ваенны аркестр Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі.
**14.00** «Зялёная планета». Дак. фільм.
**15.30** Да 105-годдзя з дня нараджэння Сяргея Сталярова. «Аповесць пра першае каханне». Маст. фільм.
**17.00** «Гульня ў бісер». «М.А. Булгакаў. «Сабачае сэрца».
**17.40** «Колер часу». Васіль Паленаў.
**17.50** Уладзімір Васільеў, Святлана Безродная, Дзмітрый Назараў, Уладзімір Зельдзін, Вера Васільева і Расійскі дзяржаўны акадэмічны камерны «Вівальдзі-аркестр» у канцэрце «Знесеныя ветрам».
**19.20** «Радня». Маст. фільм.
**21.00** Вялікая опера-2016.
**22.45** «Белая студыя». Аляксей Немаў.
**23.25** Кіно на ўсе часы. «Мадрата Кантабіле». Маст. фільм.
**1.05** «Абрабаванне па...- 2». «Фатум». М/ф для дарослых.
**1.40** Сусветныя скарбы.
**1.55** «Жывы свет з Дэвідам Атэнбора». Дак. фільм.
**2.50** «Джордж Байран». Дак. фільм.

### Настальгія

**6.00** «Галіна Вішнеўская. Вяртанне». 1992 год.
**6.50, 8.40, 9.40, 11.00, 14.50, 15.40, 1.15, 2.15, 2.45, 3.40, 5.40** Музычная настальгія.
**7.10** Маст. фільм «Жыве такі хлопец».
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** «Эліта Краіны Саветаў». Аляксандр Якаўлеў. 2008 год.
**12.40** «Вячэрнія мелодыі». 1984 год.
**13.30** Маст. фільм «Вежа».
**16.00** «Колба часу».
**17.00** Дак. фільм «Выбары-96. Страсці па ўладзе».
**18.00** «Акулы пяра». Аляксандр Новікаў. 1996 год.
**18.50** Маст. фільм «Прызнанне ў каханні».
**21.00** «Быў час». 2009 год.
**22.00** Фільм-спектакль «Антоній і Клеапатра». 1980 год.
**0.20** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім: «Гісторыя рускага року». «Звукі Му». 2006 год. 1-я частка.
**1.30** «...Да 16 і старэйшым». 1988 год.
**2.25** Маст. фільм «Дзе гэта бачылі, дзе гэта чулі».
**5.00** «Песня-83». 2-е аддзяленне.

### EuroSport 1

**4.00, 5.30, 11.30, 1.00** Футбол. Чэмпіянат MLS. Плэй-оф.
**7.00** Снукер. China Championship.
**8.30, 13.00, 20.45, 2.30** Снукер. China Championship. Фінал.
**16.30** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**17.00, 23.15** Фігурнае катанне. Этап Гран-пры. Кубак Расіі.
**18.30** Футбол. «ФІФА».
**19.00** Конны спорт. Global Champions Tour.
**20.30** Watts.

### Кінакамедыя

**0.50** Меладрама «Спатканне ўслепую».
**2.40** Баявік «Сэрца воіна».
**4.25, 15.45** Скетчкам «Паміж намі».
**5.20** Меладрама «Мой самы страшны кашмар».
**7.05** Камедыя «Вялікі Джым».
**8.50** Меладрама «Справа ў табе».
**10.30** Камедыя «Вялікі салдат».
**12.15** Камедыя «Сёння ў меню».
**14.00** Камедыя «Штосьці падобнае на шчасце».
**16.00** Камедыя «Ас з асаў».
**17.50** Меладрама «Вялікая маленькая Я».
**19.25** Камедыя «Каханне ўраз- нечы».
**20.55** Драма «Канікулы мары».
**22.40** Меладрама «Спачатку каханне, потым вяселле».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**10.10** «Хронікі маскоўскага побыту».
**11.00** «Доказ віны».
**11.35, 1.35** «Цудоўнае стагоддзе». Серыял.
**15.05** «Ілья Мурамец і Салавей-Разбойнік». Анімацыйны фільм.
**16.30** «Зоркі. Тайны. Лёсы».
**17.30** «Вакол свету. Мясціны сілы».
**18.30, 1.10** «Вулічная магія».
**19.00** «Зводныя сёстры». Меладрама.
**21.05** «Каўбоі супраць прышэльцаў». Фантастыка.
**23.15** «Каліфрэнія». Серыял.
**23.45** «Звышнатуральнае». Серыял.
**4.40** «Калі сыходзяць каханыя». Дак. фільм.

### ТБ1000

**6.10, 18.25** Камедыя «Мая жудасная нянька».



**8.10** Камедыя «З 5 да 7. Час палюбоўнікаў».
**9.55** Трылер «Помні».
**11.55** Трагікамедыя «Пра Шміта».
**14.05** Драма «Вераніка вырашае памерці».
**15.55** Камедыя «Секс у вялікім горадзе 2».
**20.10** Драма «Дварэцкі».
**22.30** Трылер «Параноя».
**0.25** Драма «Развітальны квартэт».
**2.20** Трылер «Гіпнатызёр».
**4.25** Баявік «Солт».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Камедыя «Руд і Сэм».
**8.20** Меладрама «Смайлік».
**10.15** Баявік «Слізгаценне».
**12.20** Прыгоды «Прыватнае піянерскае».
**14.10** М/ф «Іван Царэвіч і Шэры Воўк 2».
**15.30** Камедыя «8 першых спатканняў».
**17.00** Меладрама «Падарожжа з хатнімі жывёламі».
**18.45** Камедыя «Мой тата — Барышнікаў».
**20.20** Камедыя «Дзень радые».
**22.20** Меладрама «30 спатканняў».
**0.20** Драма «Каралёў».
**2.35** Драма «Экспірыенс».
**4.25** Меладрама «14+».

### National Geographic

**6.00, 12.40** Гульні розуму.
**6.50, 13.50, 5.30** Навуковыя недарэчнасці.
**7.55** Золата Юкана.
**10.20** Незвычайныя промыслы.
**11.05** Дзікі тунец.
**11.55** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**14.10** Навука будучыні.
**20.15** Конкурс аўтамабіляў будучыні.
**21.00, 1.40** Расійскія сакрэтныя матэрыялы.
**21.45, 2.30** Карставыя варонкі.
**22.30, 3.15** Ліній Наска: расшыфравана.
**23.20, 4.00** Вядомы Сусвет.
**0.50** Паранармальнае.

### Discovery

**8.00** Загадкі планеты Зямля.



**9.00** Паляўнічы на антыкварыят.
**10.00** Металаломшчыкі.
**11.00, 23.00** Востраў.
**12.00** Выжыць разам.
**13.00, 1.00** Голыя і напалоханыя.
**14.00, 22.00** Аляска: сям'я з лесу.
**15.00** Заваёўванне новых земляў.
**16.00, 21.00** Як працуюць машыны.
**17.00** Чалавек і Сусвет.
**18.00** Хуткія і гучныя.
**19.00, 0.00** Свяшчэнная сталь.
**20.00** Рэкорды на двух колах.
**2.00** У пошуках скарбаў.
**4.40** Таргі без тармазоў.
**7.10** Хуткія і гучныя.

## Ну і ну!

### Арні ледзьве не патрапіў у паліцыю

**Нямецкая паліцыя зрабіла амерыканскаму акцёру Арнольду Шварцэнэгеру вымову за язду на веласіпедзе па вакзале Мюнхена, паведамляе Bild.**



Вартавыя парадку ўбачылі двух веласіпедыстаў, якія хутка ехалі па чыгуначнай станцыі. Адзін з дзяжурных пагнаўся за імі і, параўняўшыся з тым, які трымаўся ззаду, пачаў тлумачыць яму небяспеку такіх паводзін. Мужчына адказаў, што з'яўляецца целаахоўнікам Шварцэнэгера. Вартавы парадку прыняў гэта за жарт, аднак потым убачыў, што другі парушальнік — сапраўды сам «Тэрмінатар». У адказ на тлумачэнні паліцэйскага 69-гадовы Шварцэнэгер адказаў, што ў яго баляць ногі і хадзіць яму цяжка. У якасці кампенсацыі ён прапанаваў зрабіць з ім сэлфі (фатаграфіі распаўсюдзіла прэс-служба мюнхенскай паліцыі). Пасля нядоўгай размовы акцёр пайшоў з вакзала пехатой праз паўночны ўваход, а веласіпед каціў побач. Такім чынам, Арні, хоць і зорка кіно і палітыкі, быў вымушаны паслухацца прадстаўнікаў праваахоўных органаў.

### Не бачылі вочы, што бралі

**Жыхар Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў падаў на развод са сваёй жонкай пасля таго, як упершыню ўбачыў яе без макіяжу, паведамляе Metro.**



Муж і жонка адпачывалі разам на адным з пляжаў курортнага горада Шарджа (ААЭ). Калі жанчына змыла з твару макіяж, каб зайсці ў ваду, 30-гадовы муж, імя якога не паведамляецца, заўважыў змены ў яе знешнасці. Таксама мужчына высветліў у 24-гадовай жонкі, што яна зрабіла некалькі пластычных аперацый, носіць накладныя вейкі і каляровыя кантактныя лінзы. Мужчына прыняў рашэнне развесціся. Адзначаецца, што ён адчуў сябе падманутым. Паводле слоў псіхолага, які размаўляў з дзяўчынай пасля расставання, муж адразу ж аб'явіў аб скасаванні адносін і адмовіўся размаўляць з ёй надалей.

### Каму тут тэст на дзве стужкі?

**Жыхарка горада Перм наладзіла продаж выкарыстаных тэстаў на цяжарнасць са станоўчым вынікам.**



Аб'явы аб продажы выкарыстаных тэстаў са станоўчым вынікам яна размяшчае ў сацыяльных сетках. Кошт тавару невялікі: 100 расійскіх рублёў за звычайны тэст і 200 — за тэст у пластыкавай упакоўцы. Як запэўнівае прадпрымальніца, ад кліентак няма адбою. У рэкламным аб'яўленні прапануецца тэст выкарыстоўваць як розыгрыш ці «апошні довад», каб надавіць на мужчыну і выйсці замуж. Аб маральным баку такіх дзеянняў ні сама прадпрымальніца, ні яе кліенткі не задумваюцца ■




## НЕ ЎКРАДЗІ!

...Які гэта быў год? Хутчэй за ўсё — 1994-ы. Мы з жонкай, падгадаваўшы дзяцей, сталі пакрысе абжывацца, сталі радавацца, што зводзім канцы з канцамі — нарэшце...

Але ж не тут тое было, альбо не з намі: высветлілася, што начальства ў мяне на працы «падмітусілася» і «прабіла» такі пытанне з выдзяленнем зямлі, з арганізацыяй садовага таварыства. У калектыве толькі і размоў стала, што месца для дачы дужа прывабнае, што зусім недалёка ад Мінска, што кіраўніцтва даведкі бярэ, афармляе крэдыты... «Можа, і нам «прыдбаць зямлю, займець свой кут?..» — спытаўся я ў жонкі словамі класіка.

Адчуваў: яна мяне разумее і, што называецца, абедзвюма рукамі «за». Але ж грошай у нас — кот наплакаў, а на тое, каб будавацца, іх спатрэбіцца шмат.

На сабе пераканаліся: вочы баяцца, а рукі робяць. Уступілі мы ў той кааператыў, атрымалі на 10 гадоў тры тысячы яшчэ савецкіх рублёў крэдыту і сталі дзейнічаць. Дапамагчы нам падрадзіліся нашы вясковыя сваякі. Усімі праўдамі (а дзе, відаць, і няпраўдамі) яны выпісвалі лес нібыта на дровы і з яго складалі нам зруб.

І з падмуркам пашанцавала: побач з домам знеслі невялічкую краму і нам за лічаныя капейкі аддалі бетонныя блокі.

Глядзіш — расце наш дом, пад страхой стаіць! Трэба, значыць, брацца за столь ды падлогу?

«Разведка» данесла: адзін чалавек ездзіў у Сібір на заробкі і прывёз адтуль ці не цэлы вагон дошак — шырачэзных, даўжэзных. Да таго ж не з нейкай там елкі альбо сасны, а з сапраўднай сібірскай лістоўніцы!.. Да пары да часу гэта багацце ён трымаў у чужым гаражы, каб потым прадаць. Але ж з вялікімі грашыма пакупнікі не трапляліся, а гараж трэба было вызваляць...

Нам, карацей, ён добра саступіў, у выніку чаго на ўчастку ля нашай дачы з'явілася цэлая машына дошак.

У хуткім часе прыязджаем «парадкаваць», гэта значыць, падбіваць столь. І вось жа ліха — нічога рабіць не можам. Галоўнае — з-за драбязы: няма чым нацерці шнур, каб адбіць лініі ды абрэзаць дошкі — галавешка замокла. Што рабіць? Ну вядома ж, шукаць новую: побач свецілца вокны, дым віецца над вогнішчам, цыркулярка звініць. Суседзі, значыць, таксама нешта пілуюць...

Перахтупаю іхні парог і заўважаю, ШТО: дошка ў руках «станочнікаў» шырачэзная, даўжэзная — да бабкі не хадзі — мая!

Гляджу на яе, на тых суседзяў і сказаць нічога не магу: мову адняло! І мужчыны знямелі, бо ведаюць, у каго гэтых дошак набралі.

...Не скажу, колькі мы «трымалі паўзу» (цыркулярку мужчыны адразу ж выключылі), колькі мы адно на аднаго глядзелі. І першым абазваўся не я:

— Ну гаварыі ўжо!.. Чаго маўчыш?! — глянуўшы з-пад ілба, загадаў мне сусед не сваім нейкім голасам.

— Галавешкі трэба, — «успомніў» я.

— Дык так бы і сказаў, — з палёгкай выдыхнуў гаспадар, і мы з ім пайшлі да вогнішча, дзе мяне чакала яшчэ адно «адкрыццё»: убачывшы ўбачыў, што агонь гэты сусед спецыяльна расклаў, каб спаліць... абрэзкі маіх дошак і тым самым замесці сляды.

Але ж я прыйшоў не для таго, каб іх шукаць. Мне галавешка патрэбна была, каб пачаць работу...

Распачалі і ў хуткім часе скончылі. Хапіла дошак і на столь, і на падлогу... Значыць, пра тыя, украдзеныя, можна было б забыцца?

І сапраўды, я пра іх, тым больш праз гады, не ўспамінаў бы, калі б не любімая звяздоўская рубрыка і калі б не... пачуццё віны. Так-так, маёй віны перад тым суседам. Бо калі б мяне не панесла тады па галавешку, сусед бы не спалохаўся, калі б ён не спалохаўся, то, магчыма, не захварэў бы, а калі б не захварэў, — жыў бы дагэтуль...

А што да нас з маёй палавінай, то на фінішы будаўніцтва нам зноў пашчасціла: грошы (быў такі перыяд) сталі катастрафічна абясцэньвацца. Так што крэдыт у памеры трох тысяч рублёў мы лёгка аддалі. І з таго часу спім спакойна, асабліва — на любімай дачы, дзе можна і папрацаваць, і на славу адпачыць.

**І.А.**

*г. Мінск.*

## ШТО ЗАНАДТА, ТОЕ НЕЗДАРОВА

У студэнтаў-будатрадаўцаў свае успаміны і свае прыгоды. Мы некалі ездзілі ў Пскоўскую вобласць, брыгадай з 8-9 чалавек залівалі пляцоўку пад чарговы птушнік. Бетон для гэтага нам прывозілі на машынах, а вось разносіць яго пад кудахтанне белагаловых чубатак з суседніх карпусоў птушкафабрыкі даводзілася на насілках, разраўноўваць — таксама ўручную, з дапамогай шуфля... Праца гэта вельмі цяжкая, нават для маладых здаровых хлапцоў!

І гэта шчасце, што ў ёй здараліся перапынкі: то па дарозе машына сапсуецца, то на растворa-бетонным вузле якая паломка... У нас тады іншай работы не было: мы, у чаканні новага рэйса, што называецца, лынды білі: нехта гуляў у карты, нехта загараў, нехта блукаў па наваколлі і, здаралася, прыходзіў — нават са здабыткамі.

Дык вось. Неяк раз вяртаецца на аб'ект наш сябрук Уладзя і здалёк крычыць:

— Налятай, славяне! Я вам падмацунак прынёс!

Гэты заклік (а тым больш перад абедам ды пасля цяжкай фізічнай працы) двойчы паўтараць не прыйшлося: на яго тут жа адгукнуліся ўсе — сышліся, пагледзелі ў вядро, што ж там прапануецца ў якасці падмацунку і...

Хлопцы гарадскія адразу скіслі, закруцілі насамі, адвярнуліся: маўляў, сырыя яйкі (а гэта былі яны, прычым — амаль поўнае вядро!) есці нельга. А вось вясковыя і сапраўды наляцелі. Нехта ў ахвоту выпіў два, нехта — тры. І на гэтым, відаць, не спыніліся б, але больш без солі проста не лезла.

Уладзя паглядзеў на вядро і спахмурнеў: знаку амаль не зрабілі, поўнае яно — як было, так і засталося. А спаржніцы жа трэба... І тады сябрук выгукнуў:

— Хлопцы, а давайце на яйкі ў «дурня» гуляць! Хто прайграў — куляе ячэйка, хто атрымаў «пагоны» — усе два!

— Давай!

Гэту прапанову падтрымалі ўсе, нават тыя, хто карты ў рукі не браў! Цесным колам мы абступілі ігракоў, перажывалі — ва ўсе вочы глядзелі, хто як ходзіць, хто чым адбіваецца, а найбольш, вядома ж, — хто і з якою мінаю прабівае, пракалупвае дзірачку ў чарговым яечку, каб потым, пад крыкі «Давай!», «Смялей!», можа, сем разоў скрывіцца, але ж прылажыцца да яго і выпіць.

Рогат стаяў на ўсю ваколіцу! Азарт гульні ўсё больш нарастаў! Машыны з бетонам, як на ліха, на дарозе не было. Ды і хто туды глядзеў?!

І, тым не менш, як нашы «дурні» ні стараліся, колькі ні гулялі, усе яйкі спажыць не змаглі: з паўвядзерца прынеслі на будатрадаўскую кухню.

Яешню з іх (голад не цётка) потым елі, амлет і мачанне — таксама, а вось на сырыя яйкі нават глядзець не маглі...

Праўду людзі кажуць, што задужа — тое нездарова, што занадта, тое і свінні не ядуць.

**В. Сабалеўскі,**

*г. Узда.*

## УСЁ ПРАДАЕЦЦА? ДЫ НЕ ЎСЁ КУПЛЯЕЦЦА!

Гэта гісторыя магла адбыцца ў любой з краін былога Савецкага Саюза.

Дзе адбылася? Мой сваяк казаў, што ў іх, ва Украіне.

Жыў там, значыць, адзін багацей, які не проста казаў, ён даказваў асабістым прыкладам, што «пытанне толькі ў цане», а так усё чыста, маўляў, прадаецца і ўсё чыста купляецца.

Вось ён і купляў — кватэры, машыны, дачы, гаражы, новыя фірмы, дзяўчат... Адзінае, чаго сам сабе дазволіць не мог, гэта... моднага абутку. У тым сэнсе, што купіў бы яго (можа, нават разам з фабрыкай па вытворчасці!), але вось абуць...

Галоўнае — з-за драбязы: з-за вялікага пазногця на левай назе. І не сказаць каб ён балеў альбо нарываў, — проста з характарам быў: свабоды «прасіў» у мяккім абутку. А варта было прыдбаць ды прыбрацца ў нешта мадэльнае (а крый бог яшчэ з вузкім носам!), і ўсё — канцы, хоць на сценку лезь: як цвік пад скуру загналі!

Зносіць гэта багацей не мог: звярнуўся да найлепшага хірурга, паказаў яму сваю левую нагу і праблемны палец, спытаў:

— Зможаш дапамагчы?

Той аж пакрыўдзіўся:

— Ды раз плюнуць... Мясцовы наркоз, хвілін 20 работы...

— Не-е, брат, мне гэтак не трэба, — перапыніў яго багацей. — Я болю зусім не цярплю. І крыві баюся. А таму наркоз ты мне зробіш агульны, каб я ціха заснуў, а пасля прачнуўся і пайшоў дадому. Можаш гэтак зрабіць?

— Магу.

— Аперацыя нескладаная?

— Не.

— Вынік гарантуеш?

Хірург пакрыўдзіўся яшчэ раз.

— Тады вось табе 500 еўра. Столькі ж дам пасля аперацыі. Калі лажыцца?

— Ды хоць зараз...

Патрэбы спяшацца ў багацея не было. А таму ў бліжэйшы панядзелак ля аперацыйнага стала сышліся найлепшы хірург, найлепшы анестэзіёлаг і найлепшыя медсястрычкі. Усе яны былі, што называецца, папярэджаны, усе «завостраны» на канчатковы разлік і таму за справу ўзяліся з найбольшай адказнасцю.

...Магчыма праз гэта і пайшло ўсё неяк не так, прычым з першых крокаў: анестэзіёлаг, імкнучыся зрабіць як найлепей, мусіць, перастараўся з наркозам: прыборы тут жа сталі паказваць, што ў пацыента рэзка падскочыў ціск, пачалася арытмія, а потым і наогул...

— Мы губляем яго! — з жахам заўважыў хірург і скамандаваў: — Штучнае дыханне!..

Рабіць яго кінуўся анестэзіёлаг. І нейнакш, як з таго перапуду не разлічыў свае сілы: адчуў, што пад рукамі хруснула рабрына... А можа, і не адна.

Але ж думаць пра такую «драбязу» тады не выпадала: трэба было ратаваць жыццё, запускаць сэрца...

Хай не адразу, але ж, дзякаваць богу, гэта ўдалося.

Шкада, што лепей дыхаць пацыент... не стаў.

Значыць, яго, прычым тэрмінова (бо бок стаў сіні), трэба было везці на рэнтген — глядзець, што там з рэбрамі.

Для гэтага мігам падкацілі каталку, спехам сталі перакладваць на яе пацыента і...

Не, гэта дакладна: беды па адной не ходзяць. Можа, таму, што спяшаліся, можа, таму, што важкі той мужык, як... баба з байкі Крапівы (гэта значыць, сем пудоў — не меней!), людзі ў белых халатах не ўтрымалі яго — выслізнуў на падлогу, прычым вельмі ж няўдала — зламаўшы (у двух месцах!) правую нагу.

У выніку хірургу гэтак жа тэрмінова прыйшлося складваць косці, гіпсаваць іх, потым — туга бінтаваць грудную клетку з паламанымі рэбрамі.

Карацей, у гэты дзень да пазногця чарга не дайшла: хворага (а дакладней, ледзьве жывога!) на той самай каталцы завезлі ў рэанімацыю.

І вось праз нейкі час ён там адыходзіць ад наркозу, пачынае вяртацца да жыцця. Першае, што адчувае — гэта неймаверны, невыносны боль ва ўсім целе! Спрабуе ўздыхнуць — і чамусьці не можа, мацае левы бок, свае грудзі — усё забінтавана...

Нарэшце прадзірае вочы. І ім жа не хоча верыць, бо проста перад ім — нага, як бычыцам яго, правая, але чамусьці ў гіпсе і на выцяжцы... А левая голая, босая і пазногаць на ёй — як быў, так і застаўся «ўрослым»...

Што далей было, гісторыя замоўчвае. Адзінае, што дакладна вядома: той багацей больш нікому не кажа, што купіць можна ўсё. Бо дакладна ведае: здароўе — не прадаецца, нават за вельмі вялікія грошы.

**А. Волкава,**

*г. Маладзечна.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*

---

■ Неасабісты суб'ектыў

# Бабуліны рэцэпты



### Іх не знойдзеш ні ў бліжэйшай кулінарыі, ні ў сеціве

НЕ ведаю, як у вас, а ў мяне апошнія дні кастрычніка — з мокрымі кляновымі далонямі пад нагамі, з раннімі прыцемкамі і слатой, што нечакана змяняецца ўранку густым белым туманам і ярка-жоўтым сонцам, якое праз колькі хвілін спалохана хаваецца за цяжкія свінцовыя хмары, — асацыяруецца менавіта з шаткаваннем капусты. За гэтым немудрагелістым восеньскім рытуалам спачатку з цікавасцю назіралі, а пасля і пакрысе далучаліся да яго ўсе вясковыя дзеці. Гэткае своеасаблівае першае пасвячэнне ў гаспадара ці гаспадыню — жыццёвая навука, якую за плячыма не насіць, але якая абавязкова можа спатрэбіцца.

«Сёння вечарам будзем капусту шаткаваць!»—абвяшчала ўранку за снеданнем мама. І ўвесь дзень у школе праходзіў бы на іголках, хацелася хутчэй дадому, дзе на нашай вялізнай кухні бацька ўжо прынёс са склепа і расклаваў каля печы настылыя крамяныя зеленаватыя галоўкі. Самаму малодшаму даручалася ўскочыць на печ і падаць адтуль камусьці з дарослых цяжкую цёмную ад часу шаткаўніцу — яна цэлы год, закручаная ў тканіну ад пылу, ляжала ў самым сухім месцы, на грубцы, каб не паржавелі вострыя нажы. Да гэтага рыштунку ў астатнія дні нават дакранацца дзецям было забаронена (як цяпер зразумела, выключна з меркаванняў бяспекі), але тады гэта драўляная прылада здавалася таямнічай і нават злавеснай (мне чамусьці яна ўяўлялася чароўнымі санкамі — зімовым варыянтам ведзьмінай ступы).

РАННІМ надвячоркам кухня напаўнялася яркім святлом — яно было сапраўды ярчэйшае, чым звычайна, ад бліскучабялёсай капусты, якая была паўсюль, апетытнымі гукамі — калі цяжкую галоўку разразалі, яна з сакавітым трэскам развальвалася пад нажом, зманлівым водарам — гэта пахлі выразаныя капусныя храпкі, якія можна было есці ў неабмежаванай колькасці (і ў той вечар здавалася, што нічога смачнейшага няма на свеце). А потым дарослыя, змяняючы адзін аднаго, паклаўшы шаткаўніцу на які вялікі посуд, упёршы адзін яе край у сцяну, а другі падтрымліваючы ўласным целам, пачыналі шаткаваць нарэзаныя кавалкі. Цікава і захапляльна было назіраць, як у выварцы ці бочцы хутка расце горка тонкіх белых палосак, здавалася, гэта робіцца так лёгка, так карцела самому прычыніцца да гэтага пераварэння. Нарэшце маці ці бацька, стомленыя ад гэтага «ну дай я!», здаваліся: «На, паспрабуй!» Капуста захрасала ў нажах на паўдарозе, цяжкая шаткаўніца завальвалася набок — і, знясілуенаму, пад паблажлівы смех дарослых даводзілася вяртаць да сваёй моркавы, якую — штук пятнаццаць — трэба было вымыць, пачысціць і пацерці на тарцы.

Калі нарэзанай капустай былі запоўненыя ночвы і выварка, мама пасыпала яе кменам, саліла (заўсёды на вока, жменяй), давала моркву і пачынала гэта багацце ціснуць-перамешваць. Усё нарэшце ўтрамбоўвалася ў адзін посуд, дадавалася яшчэ жменя падмарожанай каліны, наверх клаўся гнёт — адпаліраваны да бляску белы камень, і на некалькі дзён ставілася пад стол у той жа кухні — каб укісла. Галоўнае было — упільнаваць, каб не перакісла — тады капуста станавілася мяккая і нясмачная. Пасля, ужо гатовую, яе раскладалі па трохлітровых слоіках і ставілі на паліцах у халоднай кладоўцы. І без гэтай смакаты немагчыма ўжо было ўявіць ні смажанай свежыны, ні зваранай у печы костачкі — кіслая капуста з ёй, а яшчэ запраўленая густой смятанай, з варанай бульбай упрыкуску, лічылася зімой найлепшай ежай...

...ЦЯПЕР уже каторы год у адзін з кастрычніцкіх надвячоркаў мая гарадская кухня з найноўшым дызайнам і наваро̀чанай тэхнікай ператвараецца ў вясковую — шаткуем капусту. Маштабы, праўда, ужо не тыя: самае большае — шэсць вялікіх галовак, шаткаўніца — і не шаткаўніца зусім — пластыкавая тарка з адзіным шырокім (праўда, вельмі вострым) нажом, чакае свайго часу ў шуфлядзе пад плітой. Але водар, гукі, адчуванне прычынення да нейкай таямніцы тыя ж, што і шмат гадоў назад, і ад гэтага тым вечарам адчуваеш сябе крыху шчаслівейшым, чым у іншыя дні.

Я ўжо не кажу пра галоўнае — пра смак. Такой капусты (тут, бадай, можна падставіць назву любой стравы, прыгатаванай дома) не купіш ні ў адным магазіне — гэта дакладна. Як бы ні стараліся вытворцы, як бы ні пісалі, што «зроблена па бабуліных рэцэптах», — сваё ўсё роўна смачнейшае, праўда? Можа, таму, што ў кожнага была свая бабуля, якая пякла самыя смачныя дранікі, рабіла самыя смачныя варэнікі, квасіла самыя смачныя агуркі і капусту. Вучыла гатаваць усе гэтыя стравы сваіх дачок і ўнучак, каб сям'я заўжды была накормленая і задаволеная, каб перадалі пасля гэту простую навуку сваім дочкам і ўнучкам разам са шчаслівым адчуваннем далучанасці да нейкага таямнічага рытуалу.

ТОЛЬКІ вось з гэтым якраз цяпер і праблемы. Асабліва ў горадзе, дзе ў шалёным рытме не шмат думаеш пра нейкія там рэцэпты, а бліжэйшы вялікі супермаркет паслужліва падсоўвае ў паштовыя скрыні стракатыя лістоўкі «Мы гатуем для вас!» і прадае ў сваёй кулінарыі ўсё, што душа пажадае, — ад плову і варанай бульбы (не смейцеся, напрыклад, у нашым менавіта яна ідзе нарасхват) да фаршыраванага шчупака і гусей з яблыкамі. Не кажучы ўжо пра салаты і розныя саленні. На любы густ, на любую кампанію. Усё — «Па бабуліных рэцэптах». Купіў, расклаў на талеркі (самае складанае — разагрэў у духоўцы) — і ўсё, ты ўжо руплівая гаспадыня. Госці будуць есці і нахвальваць, праўда, як падаса, не зусім шчыра. І правільна падаса, бо ў сваёй кулінарыі яны купілі тое самае па тым жа «бабуліным рэцэпце»...

І прыйдзе момант, калі сапраўды захочаш здзівіць дамашніх, сабраць іх усіх на кухні адным толькі водарам прыгатаванага, як калісьці бабуля. Яна ж вучыла нас, але ўсё, як непатрэбнае, забылася. І інтэрнэт не дапаможа — рэцэпты там розныя, мудрагелістыя, але — чужыя...

БАБУЛІ ж і падумаць не маглі, што шукаць мы іх будзем менавіта там.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by* ■

## Извещение о проведении открытого аукциона на право заключения договора аренды земельного участка

**Организатор аукциона:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, д.5, тел. (0212) 426162.

| Предмет аукциона, кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка, срок аренды |
|---|
| Лот №1. Право заключения договора аренды сроком на 99 лет земельного участка с кадастровым №221050100001002336 площадью 0,3410 га по адресу: Витебская обл., Верхнедвинский р-н, г. Верхнедвинск, ул. Кобзуна для строительства объекта торговли общей площадью не менее 500 кв. м. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранные зоны линий электрических сетей напряжением до 1000В. **Нач.цена (с учетом/до деноминации)**: 49 561/495 610 000 бел.руб. **Задаток (с учетом/до деноминации):** 4 956,10/49 561 000 бел. руб. Реквизиты для внесения задатка: р/с 3641313000610 в ЦБУ №206 ф-ла №214 ОАО «АСБ «Беларусбанк» г. Новополоцк, МФО 660, УНП 300063038, код платежа 04002. Получатель платежа: Верхнедвинский райисполком |
| Дата, время и место проведения аукциона: 29.11.2016 в 10.00 по адресу: г. Верхнедвинск, ул. Кооперативная, 1 в Верхнедвинском райисполкоме. Срок внесения задатков и приема документов: с 28.10.2016 с 8.30 по 28.11.2016 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в рабочие дни с 8.30 до 17.30 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» |

Аукцион проводится в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462. **Победитель аукциона (единственный участник несостоявшегося аукциона) обязан (условия аукциона):** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона: внести плату за право заключения договора аренды зем. участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением документации, необходимой для его проведения; не позднее двух рабочих дней после внесения денежных выплат обратиться в Верхнедвинский райисполком за заключением договора аренды зем. участка; в двухмесячный срок со дня подписания договора аренды, но не позднее трех месяцев со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона аренды несостоявшимся обратиться в организацию по гос. регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним за гос. регистрацией права на зем. участок; получить в установленном порядке разрешение Верхнедвинского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство объекта в срок, не превышающий 6 месяцев; в течение 6 месяцев со дня утверждения проектной документации на строительство объекта приступить к занятию зем. участка; осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией и согласованные с Верхнедвинским райисполкомом; предусмотреть компенсационные посадки за удаленные объекты растительного мира, обследование произвести силами Верхнедвинского ГРУПП ЖКХ. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Для участия в аукционе приглашаются граждане, индивидуальные предприниматели, юр. лица, консолидированные участники (двое и более граждан, индивидуальных предпринимателей, юр. лиц). Для участия в аукционе граждане, индивидуальные предприниматели, консолидированные участники и юр. лица (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный срок подают заявление на участие в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, с отметкой банка, заключают соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования; индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем юр. лица РБ – доверенность, выданная юр. лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих гос. регистрацию юр. лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юр. лица; представителем иностранного юр. лица – легализованные копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык, легализованные доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о фин. состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем иностранного гражданина – легализованная доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; консолидированными участниками предоставляются оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов предъявляется документ, удостоверяющий личность. Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка. Конт. тел.: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by.

---

Департамент по ценным бумагам
Министерства финансов Республики Беларусь
ЗАРЕГИСТРИРОВАНО
26 октября 2016
Красинский А.Д.

УТВЕРЖДЕНО
Протокол внеочередного
Общего собрания участников
СООО «ВильнюсСтрой»
от 05 октября 2016 года

## ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОСПЕКТ ЭМИССИИ ЖИЛИЩНЫХ ОБЛИГАЦИЙ двенадцатого выпуска

**Совместное общество с ограниченной ответственностью «ВильнюсСтрой» г. Минск**

Внести в Проспект эмиссии жилищных облигаций двенадцатого выпуска следующие изменения:

1. в пункте 2.2:

1.1. в подпункте 2.2.1 слова «15 774 000 000 (пятнадцать миллиардов семьсот семьдесят четыре миллиона) белорусских рублей» заменить словами «1 577 400 (один миллион пятьсот семьдесят семь тысяч четыреста) белорусских рублей»;

1.2. в части первой подпункта 2.2.2 слова «6 600 000 (шесть миллионов шестьсот тысяч) белорусских рублей» заменить словами «660 (шестьсот шестьдесят) белорусских рублей»;

2. в части шестой подпункта 2.4.1 пункта 2.4:

2.1. в предложении первом слова «15 774 000 000 (пятнадцать миллиардов семьсот семьдесят четыре миллиона) белорусских рублей» заменить словами «1 577 400 (один миллион пятьсот семьдесят семь тысяч четыреста) белорусских рублей»;

2.2. в предложении втором слова «7 887 000 000 (семь миллиардов восемьсот восемьдесят семь миллионов) белорусских рублей» заменить словами «788 700 (семьсот восемьдесят восемь тысяч семьсот) белорусских рублей».

ОТ ЭМИТЕНТА:
Директор СООО «ВильнюсСтрой» Н.М. Яколцевич
Главный бухгалтер СООО «ВильнюсСтрой» Т.С. Журавская
ОТ ЛИЦ, ПРЕДОСТАВИВШИХ ОБЕСПЕЧЕНИЕ:
Подтверждаю достоверность информации об обеспечении:
Заместитель генерального директора ЗАСО «Промтрансинвест» С.В. Андриевич
Подтверждаю достоверность информации об обеспечении:
Заместитель генерального директора Белгосстраха М.М. Бобко
ОТ ПРОФУЧАСТНИКА:
Директор ЗАО «Генеральная система инвестиций» Н.Л. Черник

УНП 191434087

---

09.11.2016 г. в 12.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Полесьежилстрой».

Повестка дня:
1) Об изменении размера уставного фонда общества.
2) О внесении изменений в устав общества и утверждении устава ОАО «Полесьежилстрой» в новой редакции.

Местонахождение ОАО «Полесьежилстрой»: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.

Место проведения собрания: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.

Время регистрации в день проведения собрания с 11.30 до 12.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 01.11.2016 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

Наблюдательный совет. УНП 200050191

---

Утерянный представительством Белгосстраха по Первомайскому району г. Минска бланк страхового полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛБ № 1756890 **считать недействительным.**

УНП 100122726

---

Утерянные ЗАО «СК «Белросстрах» бланки страховых полисов «Добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу» формы 2РН, 2РП серии БИ №№ 1333825, 1278050, 1402483, 1407484, 1437045, 1545674, 1545681, 1461627, 1561893, 1499406, 1187821, 1349537, 1420038, 1531870, 1548617, 1548679, 1548683, 1550321, 1559568, 1559595, 1453891, 1453907, 1453928 **считать недействительными.**

УНП 100782388

---

## УВЕДОМЛЕНИЕ

**Наблюдательный совет ОАО «Универсам Рига» сообщает о проведении внеочередного общего собрания акционеров, которое состоится 17 ноября 2016 года в 16.00 со следующей повесткой дня:**

1. Об увеличении уставного фонда ОАО «УНИВЕРСАМ РИГА».
2. Об утверждении устава ОАО «УНИВЕРСАМ РИГА» в новой редакции.

Собрание состоится по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, 50, торговый центр «Рига».

Регистрация участников собрания будет проводиться в день собрания с 15.00 до 16.00.

Акционерам необходимо иметь при себе документ, удостоверяющий личность; представителю акционера – доверенность и документ, удостоверяющий личность.

УНП 100299678 Наблюдательный совет ОАО «Универсам Рига»

---

## Извещение о повторном аукционе 15 ноября 2016 г. по продаже объектов недвижимости в г. Пинске

| Наименование объекта | Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-54077 «Цех строительных металлоконструкций» | Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-54078 «Цех изготовления металлоконструкций» | Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-54080 «Заготовительный цех» | Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-44659 (здание компрессорной с прилегающими сооружениями и инженерными сетями) |
|---|---|---|---|---|
| Номер лота | 1 | 2 | 3 | 4 |
| **Местонахождение объекта** | г. Пинск, ул. Калиновского, 11И-1 | г. Пинск, ул. Калиновского, 11И-2 | г. Пинск, ул. Калиновского, 11Г-2 | г. Пинск, ул. Калиновского, 11П |
| **Тип помещения** | Совмещенное с другим изолированным помещением | Совмещенное с другим изолированным помещением | Совмещенное с другим изолированным помещением | Отдельно стоящее |
| **Общая площадь (кв. м)** | 3982,2 | 4516,7 | 3351,5 | 539,0 |
| **Площадь земельного участка для обслуживания строения (га)** | 1,444 | | | 0,1827 |
| **Начальная цена продажи** | 236 375 руб. 89 коп. | 267 967 руб. 31 коп. | 263 490,71 | 112 364,81 |
| **Сумма задатка** | 23 638 руб. | 26 797 руб. | 26 349,0 | 11 237,0 |
| **Условия продажи** | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством |
| **Характеристика объекта, площадь земельного участка (кв. м), решение об отводе земельного участка** | Одноэтажное, состоит из 3 пролетов по 2160 м² каждый. В состав входит: покрасочное отделение с локальными очистными сооружениями, водопроводная сеть – 127,4 м, канализация фекальная – 91,5 м, ливневая канализация – 143,4 м, линия электропередач – 593 м, беседка, бетонное покрытие – 2290,2 м². Ввод в эксплуатацию 1973 г. | Одноэтажное, состоит из 3 пролетов по 2160 м² каждый. В состав входит: водопроводная сеть – 157,2 м, канализационная сеть – 163,3 м, линия электропередач – 593 м, беседка, бетонное покрытие – 1922,8 м². Ввод в эксплуатацию 1973 г. | Одноэтажное, в состав входит: склад пиломатериалов 1389 м², навес 284 м², водопроводная сеть протяженностью 248,9 м, асфальто-бетонное покрытие 1876 м², бетонное покрытие 2751 м², линия электропередач (ААБЛ-10 3*95) – 200 м, ливневая канализация – 30,8 м, ремонтная мастерская, административные и санитарные помещения. Ввод в эксплуатацию 1972 г. | Одноэтажное здание. Канализационная сеть 73 м, водопроводная сеть 20,4 м, бетонное покрытие 701 м². Ввод в эксплуатацию – 1992 г. |
| **Организатор аукциона** | **Ликвидационная комиссия ОАО «Пинский КСИ», ТУП «ПриБут»** | | | |
| **Продавец аукциона** | **Ликвидационная комиссия ОАО «Пинский КСИ», ТУП «ПриБут»** | | | |

Аукцион состоится **15 ноября 2016 года в 11.00** по адресу: г. Пинск, ул. Калиновского, 11, в актовом зале.

**Перечень необходимых документов:**

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с ОАО «Пинским комбинатом строительной индустрии».
2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка: на расчетный счет ОАО «Пинский комбинат строительной индустрии» р/счет 3012470120029 в РКЦ №37 в г. Пинске филиала ОАО «Белагропромбанк» – Брестское областное управление код 401 УНП 200305504, срок внесения суммы задатка – по 14 ноября 2016 г. включительно.
3. Индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором торгов.
4. Юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники, для заверения их копий организатором торгов.
